# Нацюрморт у паэме Якуба Коласа «Новая зямля»

УДК 821.161.3.09(092)Колас+821.161.3.09-1



**Жанна ШАЛАДОНАВА,**
**кандыдат філалагічных навук**

Жанна ШАЛАДОНАВА. Нацюрморт у паэме Якуба Коласа «Новая зямля». У артыкуле раскрываюцца сэнсавая напоўненасць і сімвалічная знакавасць апісанняў застолляў у паэме Якуба Коласа «Новая зямля», ахарактарызаваных як славесны нацюрморт. Адзначаны жывапісная і змястоўна-ацэначная функцыі вобразаў ежы ў мастацка-эстэтычным кантэксце твора як паказчыкаў духоўнасці, культуры і традыцый беларусаў, іх ментальнага і фізічнага аблічча, быційна-побытавай арганізацыі. Прадэманстравана сувязь гастранамічнай культуры з камунікатыўна-ідэнтыфікацыйнымі працэсамі, гістарычным кантэкстам эпохі.
Ключавыя словы: ежа, застолле, нацюрморт, сімвал, духоўнасць, культура, нацыянальная традыцыя, камунікацыя, адзінства.

Zhanna SHALADONAVA. Still life in Yakub Kolas' poem The New Land. The article examines the deep meaning and symbolism in the descriptions of feasts in Yakub Kolas' poem The New Land. Such descriptions can be called a verbal still life. The author points to the artistic and content evaluative function of food images in the artistic and aesthetic context of the poem. These imagines symbolize spirituality, culture and traditions of Belarusians, their mental and physical characteristics, their everyday life. The author shows the link between the gastronomic culture and communicative and identification processes, historical context of the era.
Keywords: food, feast, still life, symbol, spirituality, culture, national tradition, communication, unity.

Творчай манеры Якуба Коласа ўласціва асаблівая прыхільнасць да мовы жывапісу, праяўленая ў разгорнутых маляўнічых апісаннях прыроднага, побытавага, рэчыўнага свету. Жывапіснасць заўсёды надае новыя магчымасці як у працэсе стварэння, так і ўспрымання мастацкіх тэкстаў. Апісанні як цэласныя сэнсава змястоўныя структуры арганічна ўваходзяць у мастацкія тэксты, каб перадаць неабходны фон, антураж і адначасова больш выразна абазначыць, эстэтычна і змястоўна напоўніць, сэнсава пашырыць прасторава-часавы кантынуум твораў.

У паўсядзённай і мастацкай практыцы прастора ўспрымаецца не сама па сабе, а ва ўсёй сукупнасці складнікаў, аб'ектаў, што яе напаўняюць. У выніку культурна-творчага асваення, ідэйна-сэнсавага напаўнення прасторавыя

ПРА АЎТАРА

ШАЛАДОНАВА Жанна Сяргееўна.

Нарадзілася ў в. Сідараўка Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1992), аспірантуру Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі (1995), дактарантуру Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (2022).

З 1996 года працавала малодшым навуковым супрацоўнікам, з 2006 года – старшы навуковы супрацоўнік аддзела ўзаемасувязей літаратур Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі (з 2015 года – Інстытут літаратуразнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі).

Кандыдат філалагічных навук (1998).

Аўтар звыш 170 навуковых прац, сярод якіх дзве манаграфіі, восем раздзелаў у калектыўных манаграфіях, артыкулы ў навуковых зборніках, навукова-перыядычных выданнях.

Сфера навуковых інтарэсаў: кампаратывістыка, беларуская класіка ў кантэксце ўсходнеславянскіх літаратур, паэтыка прасторы.

аб'екты вылучаюцца са свайго ўтылітарнага асяроддзя, пераўтвараюцца ў вобразы-сімвалы. В. Тапароў лічыць, што «прастора падрыхтавана да ўспрыняцця рэчаў, яна супярэчлівая і дае ім сябе, саступаючы рэчам форму і прапаноўваючы ім свой парадак, свае правілы „прасціранння" рэчаў у прасторы. Абсалютная неадметнасць („немата", „слепата") прасторы разгортвае сваю змястоўнасць праз рэчы. Дзякуючы гэтаму актуалізуецца ўласцівасць прасторы да дзялення, у яе з'яўляюцца „голас" і „аблічча", якое чуецца і бачыцца» *[1, с. 279]*.

Гастранамічная прастора, у якую ўключаны ежа, напоі, стравы, культура іх спажывання, складае найважнейшую частку прыродна-рэчыўнага свету, надзеленую сваімі характарыстыкамі, функцыямі і сэнсамі. Яе выяўленне ў структуры мастацкага тэксту можна абазначыць як славесны нацюрморт, які ўспрымаецца як натуральны кампанент жыцця чалавека, валодае канцэнтраванай семантыкай і заўсёды мае ацэначны характар, транслюючы звесткі пра эпоху, сацыяльныя і духоўна-культурныя працэсы, статус персанажаў і ўласна чалавечыя адносіны. У разуменні галандскіх майстроў жывапісу нацюрморт, stilleven, – гэта ціхае жыццё рэчаў, адпаведных у сваёй сімвалічнай знакавасці складаным працэсам унутранага жыцця чалавека. Нягледзячы на тое што з французскай і італьянскай моў нацюрморт перакладаецца як «мёртвая прырода», на думку мастацтвазнаўцаў, нацюрморт ніколі не быў мёртвым, бо заўсёды звязаны з пачуццямі, думкамі, жыццём чалавека.

Уяўленні пра тоеснасць працэсаў пазнання свету і харчавання вядомыя са старажытных часоў. На гэта звяртаецца ўвага ў дыялогах Платона пры апісанні духоўных пошукаў герояў. Так, у дыялогу «Пратагор» у размове Сакрата і Гіпакрата закранаецца глабальная праблема насычэння душы. Згадаўшы купцоў, што гандлююць цялеснаю ежай, Сакрат набліжае да іх сафістаў, што «развозят знания по городам и продают их оптом и в розницу всем желающим» *[2, с. 423]*. Мудрэц звяртае ўвагу на тое, што «знания… нельзя унести в сосуде, а поневоле придётся, уплатив цену, принять их в собственную душу и, научившись чему-нибудь, уйти либо с ущербом для себя, либо с пользой» *[2, с. 423]*. Крыніца карыснага «харчавання душы» бачыцца ў адчуванні блізкага чалавека і ў еднасці са светам.

У мастацкім тэксце, як і ў жывапісе, можа паўнацэнна рэалізавацца асноўнае прызначэнне нацюрморта, які не глядзяць, а чытаюць і разгадваюць, прычым не толькі з дапамогай розуму, але і пачуццяў і эмоцый. С. Булгакаў лічыў пачуццё найважнейшым інструментам спасціжэння свету, які ўваходзіць у нас праз вокны і дзверы нашых пачуццяў і, уваходзячы, успрымаецца і асімілюецца намі. Само жыццё ёсць у гэтым сэнсе здольнасць ужываць свет, далучацца да яго. Ежа ў гэтым сэнсе з'яўляецца выяўленнем нашага існавання, метафізічнага адзінства са светам *[3, с. 114]*.

Жывапісныя выяўленні святочных застолляў у паэме Якуба Коласа «Новая зямля», задавальняючы самыя вышуканыя эстэтычныя і смакавыя густы ў дачыненні матэрыяльнай плоці свету, выконваюць функцыю яднання з ім, трансляцыі яго духоўна-культурных сэнсаў, якія, дзякуючы феномену свята, непазбежна пазначаны невычэрпнай вітальнасцю. Аналізуючы паэму «Новая зямля», І. Навуменка адзначыў майстэрства Коласа-жывапісца, асаблівую настраёвасць створаных ім карцін, у тым ліку карцін «сялянскага банкетавання»: «Пра тое, як селянін святкуе, пра яго радасці і ўцехі „за сталом" паэт скажа не раз і не два, а намалюе цэлы шэраг зноў жа вельмі падрабязных карцін, кожнай з якіх знойдзе адпаведны настрой, колер, ці то жартоўна-іранічны, ці сагрэты іскрамётнай весялосцю, ці нават святочна-ўрачысты» *[4, с. 350]*.

Крыніцы бурнага натхнення,
Мінут вясёлых ажыўлення,
Стаяць, як біскупы, бутэлі,
І ласа ўсе на іх глядзелі.
Ляжыць гарамі ў іх падножжы
Закуска, гэта міласць божа:
Тут сыр, як першы снег бялюткі,
Каўбас прыемнейшыя скруткі,
Што толькі ёсць у Беларусі *[5, с. 112]*.

Коласаўскія апісанні ежы настолькі апетытныя ў сваёй маляўнічай дэталізаванасці, што іх папросту хочацца пакаштаваць. Багацце, якасць і колькасць прадуктаў, прадстаўленых у гэтым паэтычным нацюрморце, сцвярджаюць гастранамічную каштоўнасць ежы ў нацыянальным ладзе жыцця, указваюць на яго стабільнасць і дабрабыт. Нагляднасць апісання, перадача ў ім форм, памераў, колераў, смакаў ежы і выкліканых ёю эмоцый дазваляюць далучыцца да паўнакроўнай жыццёвай стыхіі нацыянальнага космасу, робяць сціслы малюнак неад'емнай і важнай часткай яго разгорнутых канцэптуальна насычаных характарыстык.

Уразіўшы чытача апісаннямі пышнага і багатага застолля, якое падаецца як дастаткова тыповая і натуральная з'ява жыцця і побыту беларусаў, аўтар раптоўна парушае інерцыю пералічэння прысмакаў, сутыкае паэзію з прозай сучаснага яму гістарычнага моманту пострэвалюцыйнай рэчаіснасці, канстатуючы ў ёй прыкры момант адсутнасці ежы: «А масла!.. Не! Маўчу, баюся / У час пайковай суяты / Дражніць пустыя жываты!» *[5, с. 483–484]*. Звяртаючыся да гісторыі трохрадкоўя, тэкстолаг Э. Золава заўважыла, што яны «друкаваліся ў першай публікацыі раздзела ў часопісе „Адраджэнне“ ў 1921 г., у асобным выданні паэмы 1923 г., у выданнях 1927 г., віленскіх – 1928–1929 і 1931 гг. Пачынаючы з 1934 г. яны былі зняты і больш не ўзнаўляліся ні ў прыжыццёвых, ні ў пасмяротных выданнях. Але прыгаданыя радкі не без падстаў прыводзіліся ў каментарыях» *[6, с. 198]*.

Каларытна ўзноўлены ў паэме Я. Коласа асартымент страў, іх выгляд, спосабы прыгатавання непазбежна пашыраюць характарыстыкі саміх персанажаў, смакавыя прыярытэты якіх адпаведныя іх духоўнаму і фізічнаму стану. Эфектна, апетытна, багата выяўленая ежа ўспрымаецца як сапраўдная каштоўнасць у жыцці герояў, дэманструючы іх здароўе, жывую сілу і прыгажосць.

…ўжо закуска тут чакае:
Стаяць, як горкі, скавародкі,
Тут акунькі, мянькі і плоткі,
Ды так падсмажаны, што люба
Сама да іх імкнецца губа.
Гарэлка, радасць-весялуха,
Прыемна булькае для вуха
І гэтак вочы прыцягае,
Ну, як каханка маладая! *[5, с. 173]*.

Р. Барт лічыць, што ежа служыць знакам не толькі пэўных тэм, але і пэўных сітуацый, гэта значыць у рэшце рэшт пэўнага ладу жыцця, яна яго не столькі выяўляе, колькі афішыруе. Харчаванне ёсць паводзіны, якія ідуць далей сваёй прамой мэты, замяняюць, убіраюць у сябе або абазначаюць іншыя віды паводзін, чаму менавіта і з'яўляецца знакам *[7, с. 376]*. Харчовая культура ў сям'і Міхала грунтуецца на нацыянальнай традыцыі, а забяспечанасць ежай лагічна абумоўлена працавітасцю і руплівасцю персанажаў, выступаючы паказчыкам узроўню іх дабрабыту, які ў сваю чаргу ўказвае на гаспадарлівасць як важную ментальную характарыстыку беларусаў. На думку С. Булгакава, прыкмета гаспадаркі – працоўнае ўзнаўленне або заваёва жыццёвых даброт, матэрыяльных або духоўных, у супрацьлегласць дармавому іх атрыманню. Гэта напружаная актыўнасць чалавечага жыцця дзеля выканання Боскага слова: у поце твару твайго будзеш ты есці хлеб свой *[3, с. 87]*.

Змястоўна-колькаснае напаўненне святочнага стала ў паэтычных нацюрмортах Якуба Коласа аформлена ў поўнай адпаведнасці са штодзённымі і святочнымі практыкамі жыцця і побыту беларуса і ўспрымаецца як заслужаны вынік яго цяжкай працы, паказчык яе эфектыўнасці дэманстрацыя сапраўднага кулінарнага, майстэрства. Такім чынам у коласаўскай паэме рэалізуюцца знакава-сімвалічныя функцыі ежы.


В. Свентахоўская. Нацюрморт з калінай. 1980 год


Л. Дударэнка. Сельскі нацюрморт. 1977 год

Ілюстрацыі з выдання А. Зінкевіч «Беларускі нацюрморт»

А на стале тым рай ды годзе,
Што рэдка трапіцца ў народзе,
Ляжала шынка, як кадушка,
Румяна-белая пампушка,
Чырвона зверху, сакаўная,
Як бы агонь на ёй палае,
А ніз бялюткі, паркалёвы;
Кілбасы-скруткі, як падковы,
Між сцёган, сала і грудзінак
Красуе ўсмажаны падсвінак,
Чысцюткі, свежы і румяны,
Як бы паніч той надзіманы *[5, с. 205]*.

Пералічаныя Якубам Коласам святочныя стравы і спосабы іх прыгатавання – шынка, пампушка, кілбасы, сцёгны, грудзінкі, смажаны падсвінак – сведчаць пра паслядоўнасць захавання кулінарных традыцый, ярка і каларытна адлюстроўваюць асаблівасці беларускай нацыянальнай кухні і змяшчаюць нацыянальна значны ідэнтыфікацыйны сэнс. Адмыслова падабраныя апетытныя прысмакі дапаўняюць адно аднаго, у сваім маляўнічым аздабленні ўсё гэта запечанае, вэнджанае, смажанае ствaрае раскошны нацюрморт урачыста-знамянальнага абрадавага застолля.

Багаты асартымент нацыянальных страў узмацняе ідэнтыфікацыйную цэласнасць удзельнікаў трапезы, а момант святочнасці скіроўвае матэрыяльнае напаўненне застолля да трансцэндэнтных сфер найвышэйшых сэнсаў. Сакральнасць святочнай трапезы, на думку расійскага філосафа І. Сохань, – у пераадоленні матэрыяльнасці зместу стала: на першым месцы аказваюцца магчымасць супадзеленасці ежы, яе здольнасць быць тым сутнасным, якое, уваходзячы ў сутрапезнікаў на цялесным узроўні, робіць іх роднаснымі адзін аднаму *[8, с. 120]*. Праз яднанне ў працэсе спажывання ежы ўзмацняецца роднаснасць, адзінства, згуртаванасць удзельнікаў трапезы.

Відэльцы дружна разбіраюць,
І гуртам яйкі ачышчаюць,
І па кусочку іх бяруць,
Крыху падсольваюць, ядуць *[5, с. 205]*.

У высокапаэтычных апісаннях «стала сялянскага банкету» працэс спажывання ежы атаясамліваецца з духоўным напаўненнем чалавечага арганізма, шчодрым насычэннем душы і ўзмацненнем адзінства і паразумення праз камунікацыю падчас сумеснага ўжывання ежы. Гэта той выпадак, калі, на думку Р. Барта, «прадмет харчавання ўбірае ў сябе і транслюе некаторую сітуацыю, утварае некаторую інфармацыю, валодае значнасцю, гэта значыць ён не проста ўказвае на комплекс больш-менш усвядомленых матывацый, а з'яўляецца самым сапраўдным знакам і, магчыма, функцыянальнай адзінкай нейкай камунікатыўнай структуры; размова тут не толькі пра паказное выкарыстанне ежы, не толькі пра тое, як яна ўключаецца ў рытуалы гасціннасці, – не, уся ежа ў цэлым служыць знакам для членаў некаторай групы» *[7, с. 369]*.

У разгорнутым працэсе сумеснага святкавання Якубам Коласам дэкларуецца не толькі роднаснасць сутрапезнікаў у сваім сямейным коле, але менавіта іх разамкнутасць у трансцэндэнтнасць, далучанасць індывідуальнага да найвышэйшых калектыўных форм, нацыянальна і сацыяльна аб'яднальных структур.

Падчас кожнага святочнага застолля і тостаў як неад'емных яго атрыбутаў адбываецца своеасаблівае падсумаванне пройдзенага жыццёвага этапу, яго духоўнае асэнсаванне. Урачыстая абстаноўка за святочным сталом дае адчуванне стабільнасці, перамогі ў жыццёвых выпрабаваннях і дорыць надзею на будучыню. Сялянская трапеза заўсёды падаецца Якубам Коласам як духоўна змястоўная ўрачыстая цырымонія, таінства, непасрэдным чынам звязанае з нацыянальнай культурай, «мудрым словам», узаемапаразуменнем і родавай згуртаванасцю герояў. Ежа пры гэтым, на думку І. Сохань, падлягае культурнаму афармленню, перастае адпавядаць свайму вызначальнаму біялагічнаму прызначэнню – у якасці адной з форм культуры, яна афармляецца ў сімвалічную структуру, якая выяўляе іншыя, акрамя фізічных, патрэбы чалавека. Гастранамічны парадак, нарміраванне прасторы трапезы пасродкам пэўных камунікатыўных, цялесных і маральных практык, выяўляе імкненне да дысцыплінавання і цывілізавання цялеснасці, таксама спецыфікуе ежу як чалавечую, але больш за ўсё ён выяўляе ўзровень валодання культурай у прынцыпе *[8, с. 51–52]*.

Вось бацька чарку налівае
І вочы ўгору падымае.
– Дай, Божа, за год дачакаць
Здаровым, вясёлым, жывым
І новы вялікдзень спаткаць
У добрым здаровейку ўсім,
Каб гора і смутку не зналі.
– Дай Божа! – разам адказалі *[5, с. 205]*.

Напаўненне гастранамічных нацюрмортаў у коласаўскай паэме ў пэўным сэнсе выступае адным з паказчыкаў духоўнасці беларуса, цесна звязана з сістэмай яго рэлігійна-абрадавых вераванняў. Паказная натуралістычнасць апісанняў страў аб'яднана з адмысловай сімволікай, што чакае сваёй расшыфроўкі. Гэта нядзельны сняданак, прымеркаваны да мядовага Спасу «падгляд пчол», калядная вячэра, велікоднае застолле. Так, напрыклад, у раздзеле «Каляды» пры апісанні каляднай вячэры Якуб Колас двойчы спыняе ўвагу на рыбных стравах – падсмажаных «акуньках, мяньках і плотках» і квасе. Гэтыя стравы карэлююць з сакральным сэнсам: рыба – сімвал Хрыста. Зусім у традыцыях класічных жывапісцаў аўтарам паэмы ў нацюрморце «схавана» хрысціянская сімволіка:

Спыніцца мушу я на квасе:
Ён колер меў чырванаваты;
Тут быў таран, мянёк пузаты,
Шчупак, лінок, акунь, карась,
Кялбок і ялец, плотка, язь,
Яшчэ засушаныя з лета *[5, с. 174]*.

Такім чынам, паэтычныя гастранамічныя нацюрморты Якуба Коласа дакладна і жывапісна адлюстроўваюць не толькі рэальныя кулінарныя прыярытэты беларусаў, але і прыўносяць важныя ўдакладненні ў іх ментальныя і фізічныя характарыстыкі, выяўленне духоўных інтарэсаў і маральна-этычных каштоўнасцей. Гэтыя лаканічныя, але яркія і эфектныя мастацкія палотны змяшчаюць інфармацыю пра моцны калектыўнаідэнтыфікацыйны пачатак у свядомасці суайчыннікаў, іх гаспадарлівасць, патрыярхальнасць, заснаваныя на веры спрадвечныя звычаі – пра ўсё, што фарміруе гастранамічную культуру нацыі і выступае гарантам яе жыццёвай упарадкаванасці і стабільнасці, устойлівага сацыяльнага ўкладу, далучаецца да фундаментальных асноў жыцця.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 29.05.2023 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Топоров, В.Н. Пространство и текст / В.Н. Топоров // Текст: семантика и структура: сб. ст. / АН СССР, Институт славяноведения и балканистики. – М.: Наука, 1983. – С. 227–285.
2. Платон. Собрание сочинений: в 4 т. / Платон. – М.: Мысль, 1990–1994. – Т. 1 / общ. ред. А.Ф. Лосева и др.; авт. вступ. статьи А.Ф. Лосев; примеч. А.А. Тахо-Годи; пер. с древнегреч. В. Соловьева и др. – 1990. – 860 с.
3. Булгаков, С.Н. Философия хозяйства / С.Н. Булгаков. – М.: Наука, 1990. – 413 с.
4. Навуменка, І.Я. Збор твораў: у 10 т. / І.Я. Навуменка. – Мінск: Маст. літ., 2012–2017. – Т. 8: Янка Купала. Якуб Колас: духоўны воблік героя: літаратуразнаўчыя працы / падрыхт. тэкстаў, камент. і пасляcл. У. Чароты; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і літ. – Мінск: Маст. літ., 2017. – 637 с.
5. Колас, Я. Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1972–1978. – Т. 6: Паэмы «Новая зямля» і «Сымон музыка». – 1974. – 624 с.
6. Золава, Э. Да праблемы выбару асноўнага тэксту паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» / Э. Золава // Каласавіны. Творчая спадчына Якуба Коласа ў парадыгме грамадска-інтэлектуальнага асяроддзя пісьменніка: матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, Мінск, 30 кастрычніка 2007 г. / складальнікі: З.М. Камароўская, Г.І. Зайцава. – Мінск, 2008. – С. 198–202.
7. Барт, Р. Система Моды. Статьи по семиотике культуры / Р. Барт. – М.: Издательство им. Сабашниковых, 2004. – 512 с.
8. Сохань, И.В. Тоталитарный проект гастрономической культуры (на примере Сталинской эпохи 1920–1930-х годов) [Электронный ресурс] / И.В. Сохань. – Томск: Изд-во Том. ун-та, 2011. – 232 с. – Режим доступа: https://www.hse.ru/data/2011/09/18/1211374100/Книга_Сохань.pdf. – Дата доступа: 19.05.2023.